З 27 па 29 верасня ў Крамлі праходзіў Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС. Пленум абмеркаваў пытанні:

Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці.

Аб скліканні чарговага XXIII з'езда КПСС.

З дакладам па першаму пытанню выступіў член Прэзідыума ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР тав. А. М. Касыгін.

З дакладам па другому пытанню выступіў Першы сакратар ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнеў.

Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС аднадушна прыняў пастанову «Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці».

Пленум аднадушна прыняў пастанову па дакладу тав. Л. І. Брэжнева аб скліканні чарговага XXIII з'езда КПСС.

Вырашана склікаць чарговы XXIII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза 29 сакавіка 1966 года.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 27—28 (616) | Пятніца, 8 кастрычніка 1965 г. | Год выдання XVIII | Цана 1 кап.

# ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ—У ЦЭНТР УВАГІ!

4-га кастрычніка 1965 года ў актавай зале галоўнага корпуса адбыўся агульнаўніверсітэцкі справаздачна-выбарны партыйны сход.

Абмеркаваны наступныя пытанні:
1. Справаздача парткома;
2. Выбары парткома;
3. Выбары дэлегатаў на партыйную канферэнцыю горада Мінска;
4. Аб вылучэнні камуністаў у групу садзеяння партыйна-дзяржаўнаму кантролю.

Ніжэй друкуюцца матэрыялы сходу.

## (Са справаздачнага даклада сакратара парткома А. Я. Бураўскага)

справаздачны перыяд партыйная арганізацыя, рэк- , прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта ...алі сваю галоўную задачу—падрыхтоўку высока- ...фікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі. ...ы, навукі і культуры, займаліся фарміраваннем ...ксісцка-ленінскага светапогляду будучых спецыя- ...ў, высокай камуністычнай свядомасці. Ва універсі- ... праароблена значная работа па ўдасканаленню ...бнага працэсу. Лепш стала арганізоўвацца вытвор- ... практыка, па-новаму будавалася чытанне вучэбных ...саў, правядзенне лабараторных і практычных занят- ... Пытанні барацьбы за трывалыя і глыбокія веды ...одзілі шырокае адлюстраванне на партыйных схо- ... первічных арганізацый. Напрыклад, на партсходзе ...лагаў гаварылася аб паляпшэнні працоўнага выха- ...ня студэнтаў, іх вучобы. На біялагічным факультэце камуністы абмяркоўвалі пытанне аб самастойнай рабоце над праграмным матэрыялам. Такі парадак дня партсходаў сведчыць аб тым, што партыйныя арганізацыі сталі больш канкрэтна займацца вучэбнай работай студэнтаў.



Яны нядаўна сталі камуністамі.

**НА ЗДЫМКУ:** студэнты другога курса гістфака **ЛЕАНІД КІСЕЛЬ і ІГАР ШУРМОЎСКІ.**

Вынікі экзаменаў даказваюць, што праграмны матэрыял большасцю студэнтаў засвоен упаўне здавальняюча, прычым, камуністы паказалі некалькі лепшую паспяховасць. Аднак, партыйную арганізацыю не можа не трывожыць тая акалічнасць, што вялікі працэнт студэнтаў не паспявае. Напрыклад, 39 працэнтаў студэнтаў хімічнага факультэта ў час вясенняй сесіі атрымалі нездавальняючыя адзнакі. За справаздачны перыяд 62 чалавекі выключаны з універсітэта за непаспяховасць і ненаведванне заняткаў. Пры ўсім станоўчым, неабходна сказаць, што партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі, дэканаты і кафедры, а таксама нашы выкладчыкі ўсё яшчэ недастаткова змагаюцца за ўмацаванне вучэбнай дысцыпліны студэнтаў, за добрасумленныя адносіны да вучобы і працы.

За мінулы вучэбны год павысіўся ўзровень навукова-даследчай работы. Члены кафедры навуковага камунізма распрацоўваюць такія праблемы, як суадносіны дэмакратычных і сацыялістычных задач у класавай барацьбе на сучасным этапе, усебаковае развіццё асобы, заканамернасці развіцця культурнай рэвалюцыі. На кафедры гісторыі філасофіі і логікі, навуковага атэізма, этыкі і эстэтыкі з удзелам кафедраў другіх ВНУ пад кіраўніцтвам прафесара І. М. Лушчыцкага вядзецца комплекснае даследаванне па тэме «Рух за камуністычную працу і будаўніцтва камунізма ў СССР». Камуністы кафедры палітычнай эканоміі даследуюць праблемы агульнага крызісу капіталізма, перарастання сацыялізма ў камунізм, інтэнсіфікацыі спецыялізацыі сельска-гаспадарчай вытворчасці, яе аптымальнага планавання. Заслугоўвае адабрэння праведзеная ў гэтым годзе канферэнцыя маладых вучоных, прысвечаная Ленінскім дням. Прачытана больш 80 дакладаў па гісторыі, філасофіі, палітэканоміі, філалогіі і іншых навуках, многія з якіх высока ацэнены грамадскасцю. Узмацнілася дзейнасць прыродазнаўчых кафедр і лабараторый. З ліку завершаных навуковых работ 14 прызнаны арыгінальнымі і атрымалі патэнты Дзяржкамітэта па вынаходству пры Савеце Міністраў СССР. Кафедра фізічнай хіміі ў садружнасці з інстытутам агульнай і неарганічнай хіміі Акадэміі Навук БССР даследуюць магчымасці замены дарагіх і імпартных матэрыялаў, якія ўжываюцца зараз на калійных камбінатах для абагачэння калійных солей, танным арганічным злучэннем. Гэтыя прыклады сведчаць аб узрастаючым укладзе нашых вучоных у сферу матэрыяльнай вытворчасці. Аднак, гэта не азначае, што ўсе магчымасці навуковай работы ў нас вычарпаны. Неабходна карэнным чынам палепшыць якасць навуковых даследаванняў, расшырыць іх тэматыку, больш цесна звязваць з задачамі стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма.

Разглядаючы арганізацыйна-партыйную работу, дакладчык многа ўвагі ўдзяліў пытанню палітычнага выхавання новага папаўнення радоў партыі. Важным сродкам умацавання партыйнай дысцыпліны з'яўляюцца партыйныя сходы. Аднак, асобныя камуністы іх не наведваюць. За справаздачны перыяд партком прыцягнуў да партыйнай адказнасці за гэта 11 членаў і кандыдатаў КПСС. Нельга прайсці і міма такога факта, што значная частка камуністаў не праяўляе актыўнасці на сходах. Прычым, прычынай нізкай актыўнасці камуністаў з'яўляецца нездавальняючая падрыхтоўка сходаў асобнымі партыйнымі бюро. У шэрагу выпадкаў на партсходах ставяцца нязначныя пытанні, не праяўляецца творчая ініцыятыва. Калі прагледзець парадак дня партыйных сходаў партарганізацыі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, то цяжка вызначыць, ці яны з партыйных сходаў ці з вытворчых нарад. Усё гэта гаворыць аб тым, што парткому, партбюро патрэбна глыбей уваходзіць у сутнасць партыйнай работы, ставіць на абмеркаванне найбольш надзённыя, цікавыя для камуністаў пытанні, прымаць па іх канкрэтныя рашэнні і на гэтай аснове ўцягваць у актыўную работу ўсіх камуністаў.

Партком удзяляў пастаянную ўвагу падбору, расстаноўцы і выхаванню выкладчыцкіх кадраў. Аднак, на вялікі жаль, мы не пазбеглі тут сур'ёзных памылак. У свой час на кафедру гісторыі КПСС выкладчыкам быў прыняты Ганчароў. Прайшло два месяцы, і ён пачаў піць, трапіў у выцвярэзнік. Давялося пазбаўляцца ад такога супрацоўніка. Выпадковым чалавекам на кафедры гісторыі філасофіі і логікі аказаўся і Мураўёў—выкладчык атэізма. Жыццё паказала, што памылковым было рашэнне аб прыёме на кафедру навуковага камунізма Мілаванава, які на працягу года не змог праявіць сябе са станоўчага боку.

У мэтах далейшага павышэння ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню выкладчыкаў, узмацнення іх палітычнай загартоўкі выкарыстоўваліся розныя формы работы. Былі прыняты меры па паляпшэнню палітычнай інфармацыі выкладчыкаў па важнейшых пытаннях жыцця нашай краіны. З дакладамі аб рашэннях партыі і ўрада на адкрытых партыйных сходах універсітэта выступілі сакратары ЦК КПБ таварышы К. Т. Мазураў і С. О. Прытыцкі, намеснік старшыні Савета міністраў БССР таварыш І. Ф. Клімаў, міністр сельскай гаспадаркі БССР таварыш С. Г. Скарапанаў. Для выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў універсітэта быў прачытан цыкл лекцый буйнымі спецыялістамі па праблемах гісторыі, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, філасофіі, біялогіі, навейшых дасягненнях навукі і тэхнікі.

Усе гэтыя меры садзейнічалі таму, што ва універсітэце накоплен значны вопыт па палітыка-выхаваўчай рабоце з моладдзю, правядзенню індывідуальных гутарак у акадэмічных групах. Добры прыклад тут паказвалі выкладчыкі С. А. Лысенка, О. Ф. Якушка, В. П. Барадзіна, В. А. Мельцар, Л. І. Савасцьянава, Н. А. Ганчарова і іншыя. Умела развіваючы ініцыятыву саміх студэнтаў, яны праводзілі сустрэчы са знатнымі людзьмі, арганізоўвалі чытанне лекцый і многа іншых цікавых мерапрыемстваў. Веданне кожнага студэнта, уменне своечасова прыйсці на дапамогу людзям, а калі патрэбна, і строга патрабаваць з імі — не праходзіць дарэмна. Моладзь любіць і паважае гэтых выкладчыкаў, высока цэніць іх бескарыслівую працу. Вывучэнне студэнтаў, індывідуальная работа з імі з'яўляецца важнейшым шляхам выхавання нашай моладзі. Пагэтаму новаму складу парткома патрэбна ўдасканальваць формы і метады выхавання, вывучаць і папулярызаваць усё найлепшае, што нараджае практыка.

*(Заканчэнне на 2-й старонцы).*

